**Установа адукацыі**
**«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт**
**імя Францыска Скарыны»**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце

________________ А.В. Крук
(подпіс)
________________2017

# ПРАГРАМА ЎСТУПНЫХ ІСПЫТАЎ ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ "БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА" ДЛЯ АСОБ, ЯКІЯ МАЮЦЬ АГУЛЬНУЮ СЯРЭДНЮЮ АДУКАЦЫЮ, ДЛЯ АТРЫМАННЯ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ І СТУПЕНІ, 2017 ГОД

Праграма распрацавана на аснове Праграмы ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура" для асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю, для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені, 2017 год, зацверджанай загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28.10.2016 № 847

Гомель 2017

УТВЕРЖДЕНО
Приказ Министра образования
Республики Беларусь
от 28.10.2016 № 847

Праграма ўступных іспытаў
па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура»
для асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю,
для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені,
2017 год

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Змест праграмы адпавядае патрабаванням адукацыйнага стандарту і суаднесены са зместам вучэбнай праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання па беларускай літаратуры. Праграма грунтуецца на ўзаемасувязі прынцыпаў дэмакратызацыі і гуманізацыі, пераемнасці і даступнасці навучання, арыентуе на асэнсаванне духоўных і маральных каштоўнасцей.

Праграма ўключае творы вуснай народнай творчасці і мастацкай літаратуры, звесткі пра асноўныя перыяды беларускага і сусветнага мастацкага працэсу, звесткі аб жыцці і творчасці вядомых майстроў слова, асноўныя тэарэтыка-літаратурныя паняцці.

Літаратурныя творы адабраны з улікам іх мастацкай і агульначалавечай значнасці, выхаваўчай каштоўнасці, месца ў творчасці пісьменніка і ў гісторыі літаратуры, актуальнасці для нашага часу. Пры гэтым улічваліся гуманістычны сэнс твораў, дыялектычная сувязь сацыяльнага, канкрэтна-гістарычнага і агульначалавечага ў іх, мастацкая своеасаблівасць, аўтарская пазіцыя.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ АБІТУРЫЕНТАЎ

На ўступных іспытах абітурыент павінен *ведаць*:

асноўныя этапы і заканамернасці развіцця беларускай літаратуры (ад старажытных часоў да сучаснасці);

сутнасць і характэрныя асаблівасці асноўных мастацкіх сістэм (барока, класіцызм, асветніцтва, сентыменталізм, рамантызм, рэалізм, мадэрнізм), родаў і жанраў літаратуры;

найбольш важныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, творчасць якіх вывучаецца манаграфічна;

змест, праблематыку, сістэму вобразаў, сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці твораў, якія ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі

вывучаліся тэкстуальна, іх канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне;

неабходны мінімум звестак па тэорыі літаратуры, патрэбных для аналізу і ацэнкі мастацкіх твораў (змест і форма; сюжэт, кампазіцыя; тэматыка, праблематыка, пафас твора); адметнасці паэзіі і прозы як асноўных відаў (тыпаў) літаратурнай творчасці; асноўныя паняцці вершаскладання (рытм, рыфма, страфа, вершаваны памер).

Абітурыент павінен *умець*:

даваць ідэйна-эстэтычную ацэнку прачытаным творам і абгрунтоўваць яе;

выяўляць характэрныя родавыя і жанравыя, стылёвыя асаблівасці вывучаных твораў;

аналізаваць сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці вывучаных твораў, характарызаваць герояў эпічных і драматычных твораў, а таксама вызначаць важнейшыя адметнасці лірычных герояў тых твораў, якія вывучаліся тэкстуальна;

выяўляць асноўныя адметнасці стылю (творчай індывідуальнасці) пісьменніка;

перадаваць блізка да тэксту або цытаваць урыўкі з твораў, якія прапанаваны вучэбнай праграмай для завучвання на памяць.

Адказ павінен быць прадуманым, звязным, паслядоўным. Маўленне абітурыента на ўступных іспытах па беларускай літаратуры павінна вызначацца дакладнасцю, правільнасцю, аргументаванасцю, выразнасцю, лексічным багаццем; улічваючы спецыфіку беларускай літаратуры як вучэбнага прадмета, выказванне на іспыце можа мець рысы мэтазгоднай эмацыянальнасці, вобразнасці, індывідуальна-творчыя элементы.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Фальклор і літаратура

Спецыфіка фальклору як мастацтва слова. Асноўныя фальклорныя жанры (казкі, легенды, паданні, песні і інш.). Беларуская народная творчасць як крыніца станаўлення і ўзбагачэння літаратуры.

### Літаратура эпохі Сярэднявечча

Агульная характарыстыка літаратуры Сярэднявечча. Пачатковы перыяд развіцця славянскай пісьменнасці (XI—XII стст.); тэматычная і жанравая разнастайнасць перакладной і арыгінальнай літаратуры (Біблія, «Жыціе Ефрасінні Полацкай», словы, казанні, павучанні Кірылы Тураўскага, беларускія летапісы).

## Літаратура эпохі Адраджэння

Агульная характарыстыка літаратуры эпохі Адраджэння (XIV—XVI стст.).

*Францыск Скарына* — першадрукар і асветнік, яго жыццё і творчая дзейнасць. Пераклад і выданне кніг Бібліі, іншых кніг Святога Пісання. Найважнейшыя рысы рэнесанснага гуманізму ў творчасці Ф. Скарыны. Агульначалавечы змест прадмоў да кніг «Іоў» і «Юдзіф». Сцвярджэнне ідэй патрыятызму, вернасці грамадзянскаму абавязку, духоўнай моцы і трываласці. Агульнаславянскае і еўрапейскае значэнне дзейнасці Ф. Скарыны.

*Сымон Будны і Васіль Цяпінскі* як прадаўжальнікі традыцый Ф. Скарыны. Дэмакратычная і патрыятычная скіраванасць прадмоў да выдадзеных на беларускай мове «Катэхізіса» і «Евангелля».

*Мікола Гусоўскі.* Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць паэта. «Песня пра зубра» як выдатны твор беларускай літаратуры эпохі Адраджэння. Жанр, сюжэт і кампазіцыя паэмы. Сістэма вобразаў у творы. Сімвалічнае значэнне вобраза зубра. Беларуская прырода ў адлюстраванні паэта. Тэма вайны і міру ў творы. Пераклады паэмы.

## Барока. Класіцызм. Асветніцтва

Палемічная літаратура пачатку XVII ст. Развіццё рэлігійнай публіцыстыкі (Іпацій Пацей, Мялецій Сматрыцкі, Лаўрэнцій Зізаній, Афанасій Філіповіч). Свецкая сатырычная літаратура («Прамова Мялешкі», «Ліст да Абуховіча»). Вершаскладанне на беларускай мове. Андрэй Рымша, Сімяон Полацкі, ананімныя творы.

Станаўленне беларускага тэатра (батлейка, школьныя драмы і інтэрмедыі).

## Ад старажытнай да новай беларускай літаратуры

Беларуская літаратура ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. Пераважна ананімны характар бытавання твораў. Узнікненне камічных, бурлескных твораў. Паступовы рух да ўтварэння новай літаратуры на народнай, дыялектнай моўнай аснове. Узнікненне і ўмацаванне ў літаратуры рэалістычных традыцый. Станаўленне новай беларускай літаратуры і яго асноўныя фактары (цікавасць да фальклору, народнага побыту, гістарычнага мінулага і традыцый).

Паэма «Энеіда навыварат» (урыўкі). Пытанне аб аўтарстве паэмы і часе напісання. Ідэйны пафас і змест. Сувязь беларускай «Энеіды» з аднайменнымі творамі Вергілія і І. Катлярэўскага.

Рамантызм як вядучы літаратурны напрамак

Рамантызм у еўрапейскім і беларускім мастацтве слова канца XVIII — першай паловы XIX ст. як вядучы літаратурны напрамак.

*Ян Баршчэўскі.* «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (2—3 апавяданні на выбар абітурыента). Цесная сувязь апавяданняў з беларускай міфалогіяй і фальклорам. Роля вобраза Завальні ў творы. Увага да ўнутранага свету герояў. Павучальнасць зместу апавяданняў. Рамантычныя сюжэты і вобразнасць. Сімволіка вобразаў.

Па шляху сінтэзу:
сентыменталізм, рамантызм, рэалізм

*Канстанцін Вераніцын.* Сатырычны і гуманістычны пафас паэмы «Тарас на Парнасе». Сцвярджэнне ідэй народнасці ў літаратуры. Роля міфалагічных персанажаў у раскрыцці тэмы і ідэі твора. Тарас як тыповы народны герой, рысы яго характару. Майстэрства аўтара ў абмалёўцы персанажаў. Гісторыка-літаратурнае значэнне паэмы.

*Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.* Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Жанравае вызначэнне твора «Пінская шляхта». Выкрыццё царскага чыноўніцтва. Вобраз Кручкова, яго тыповасць. Духоўная абмежаванасць засцянковай шляхты. Майстэрства драматурга ў разгортванні інтрыгі, сюжэта, у стварэнні камічнага эфекту. Гратэск і шарж як прыёмы фарса-вадэвіля. Значэнне творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча для беларускай літаратуры.

Рэалізм як літаратурны напрамак.
Захаванне тэндэнцый рамантызму

Агульная характарыстыка літаратуры другой паловы XIX ст. Публіцыстыка і яе роля ў тагачасным грамадскім жыцці. Ананімныя вершаваныя і празаічныя гутаркі («Вось які цяпер люд стаў», «Гутарка Данілы са Сцяпанам», «Сход»). Узмацненне ў літаратуры Беларусі другой паловы XIX ст. рэалістычных тэндэнцый.

*Кастусь Каліноўскі.* Адлюстраванне поглядаў Кастуся Каліноўскага на гісторыю і асобу ў выданнях «Мужыцкай праўды». Вобраз Беларусі ў творах К. Каліноўскага. «Пісьмо з-пад шыбеніцы» і верш «Марыська чарнаброва, галубка мая» як запавет нашчадкам.

*Францішак Багушэвіч.* Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Уплыў паўстання 1863—1864 гг. на творчасць Ф. Багушэвіча. Ідэйны змест прадмоў да зборнікаў «Дудка беларуская» і «Смык беларускі». Месца паэта і паэзіі ў жыцці народа («Мая дудка»). Увасабленне ў паэзіі Ф. Багушэвіча грамадскіх ідэалаў («Ахвяра»). Алегарычны змест верша «Хмаркі».

Паэма «Кепска будзе!». Выкрыццё сацыяльнай несправядлівасці ў творы. Паказ жыццястойкасці беларускага народа. Роля айчыма ў лёсе Аліндаркі. Матыў трагічнасці і безвыходнасці. Гуманістычны ідэал аўтара ў паэме.

## Беларуская літаратура пачатку XX ст.

Беларуская літаратура пачатку XX ст., яе патрыятычны пафас і вернасць гуманістычным ідэалам. Роля газет «Наша доля», «Наша ніва» ў гісторыі айчыннай культуры і мастацтва слова. Нашаніўскі перыяд у развіцці літаратуры. Агляд творчасці Цёткі, Ядвігіна Ш. і інш.

*Янка Купала.* Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Тэматычная шматграннасць і стылёвая разнастайнасць лірыкі Янкі Купалы. Асэнсаванне гістарычнага лёсу беларускага народа («Мая малітва» і інш.). Грамадзянскасць і публіцыстычнасць у вершах Янкі Купалы, жанравае, вобразнае, інтанацыйнае багацце яго лірыкі («Роднае слова» і інш.). Ідэя вечнасці жыцця, кахання, гармонія чалавека і прыроды ў вершы «Явар і каліна». Лірыка перыяду станаўлення беларускай дзяржаўнасці 1920—1930-х гг. («На сход!», «Паязджане» і інш.).

Паэма «Бандароўна». Фальклорная першакрыніца паэмы. Сутнасць канфлікту. Вобразы-антыподы. Драматызм дзеяння. Маральнае хараство Бандароўны. Рамантычная аснова твора.

П’есы «Паўлінка» або «Раскіданае гняздо» (на выбар абітурыента).

Высмейванне шляхецкай пыхлівасці і духоўнай абмежаванасці ў камедыі «Паўлінка». Канфлікт новага і старога пакаленняў засцянковай шляхты. Вобраз Паўлінкі. Майстэрства аўтара ў абмалёўцы персанажаў, індывідуалізацыя іх мовы. Сцэнічнае ўвасабленне камедыі.

Сацыяльна-філасофскі, гуманістычны пафас і змест п’есы «Раскіданае гняздо». Жанр, кампазіцыя, развіццё драматычнага канфлікту. Галоўныя героі драмы, матывы паводзін. Пошукі маладым пакаленнем рэальных шляхоў вызвалення Бацькаўшчыны. Праўда Сымона і праўда Зоські. Старац як выразнік народнай маралі. Вобраз Незнаёмага ў сістэме дзейных асоб п’есы. Рэалізм драмы, рамантычная сімволіка і лірызм. Сімвалічнасць назвы твора.

*Якуб Колас*. Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Лірыка. Элегічнае і аптымістычнае ў паэзіі Якуба Коласа («Не бядуй!», «Беларусам»). Паэтызацыя роднай прыроды («Родныя вобразы», «Першы гром»). Рытміка-інтанацыйны лад вершаў Якуба Коласа.

«Новая зямля» — мастацкая энцыклапедыя народнага жыцця. Аўтабіяграфічнасць паэмы, яе творчая гісторыя. Жанравыя асаблівасці твора. Народны побыт і прырода ў паэме. Вобразы ў паэме: мудрасць і душэўная прыгажосць Антося, Ганны; вобразы дзяцей. Трагедыя лёсу

Міхала. Філасофская ідэя зямлі і волі. Сімвалічны сэнс назвы твора. Паэтычнае майстэрства Якуба Коласа.

Трылогія «На ростанях» (частка першая — «У палескай глушы»). Гісторыя напісання і праблематыка, асаблівасці сюжэта і кампазіцыі твора, яго аўтабіяграфізм. Асоба Андрэя Лабановіча. Народ і інтэлігенцыя ў творы. Жаночыя вобразы. Майстэрства Коласа-празаіка. Месца і значэнне творчасці Якуба Коласа ў беларускай літаратуры.

*Максім Багдановіч.* Жыццёвы і творчы шлях паэта. Погляды М. Багдановіча на прызначэнне паэта ў грамадстве («Песняру»). Вобраз Радзімы ў лірыцы паэта («Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...») і інш.). Зварот да культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі («Летапісец» і інш.). Скіраванасць да агульначалавечай праблематыкі («Мяжы», «Жывеш не вечна, чалавек...» і інш.).

«Страцім-лебедзь». Паэтычная інтэрпрэтацыя біблейскага міфа. Роля баладнай формы ў актуалізацыі сімволікі твора.

Сувязь творчасці М. Багдановіча з класічнай спадчынай і сусветнай паэзіяй.

*Алесь Гарун.* Зборнік вершаў «Матчын дар». Вызваленча-патрыятычныя, агульначалавечыя матывы («Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...»). Абвостранае пачуццё любові да Радзімы. Тэма сэнсу жыцця, прызначэння чалавека («Ідуць гады»). Філасафічнасць і публіцыстычнасць вершаў.

### Беларуская літаратура першай трэці ХХ ст.

Актывізацыя літаратурна-грамадскага руху і ўздым культурнага будаўніцтва ў 1920-я гг. Літаратурныя аб’яднанні «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», іх роля ў гісторыі айчыннага пісьменства. Творчыя здабыткі і пошукі 1920-х гг. і іх спад у 1930-я гг. пад уплывам ідэалагізацыі літаратурнага жыцця. Утварэнне Саюза пісьменнікаў СССР (1934 г.).

Літаратура Заходняй Беларусі, яе сувязь з агульнанацыянальнай літаратурай (У. Жылка, Максім Танк, М. Машара, В. Таўлай, Міхась Васілёк і інш.).

*Максім Гарэцкі.* Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. Тэма вернасці роднай зямлі, служэння інтэлігенцыі народу ў апавяданні «Роднае карэнне». Вобраз Архіпа Лінкевіча. Жыццёвая мудрасць дзеда Яхіма, яго запавет маладому пакаленню.

Суровая праўда пра Першую сусветную вайну, выкрыццё яе антынароднай, антычалавечай сутнасці ў апавяданні «Літоўскі хутарок». Аўтабіяграфічнасць апавядання. Вобраз Яна Шымкунаса. Гуманістычная канцэпцыя пісьменніка.

*Змітрок Бядуля.* Апавяданне «Бондар». Вырашэнне тэмы мастака і мастацтва ў кантэксце сацыяльных праблем. Вобраз майстра-працаўніка. Асуджэнне эстэтычнай неразвітасці, чэрствасці і абыякавасці. Мастацкія адметнасці твора.

*Уладзімір Дубоўка.* Вершы «Залатая асенняя раніца», «О Беларусь, мая шыпшына…», «Пальцы жоўтых кляновых лістоў», «Родная мова, цудоўная мова…» (2—3 вершы на выбар). Асноўныя матывы лірыкі. Услаўленне сілы народа, духоўнасці, вальналюбства чалавека, паэтызацыя красы прыроды, кахання. Высокая культура верша, багацце жанравых форм. Сувязь лірыкі з традыцыямі фальклору, паэзіяй Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча.

*Кандрат Крапіва.* Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Байкі «Дыпламаваны Баран», «Махальнік Іваноў». Высмейванне самаўпэўненасці, нахабства, тупасці, падхалімства і іншых чалавечых заган.

П’еса «Хто смяецца апошнім». Час напісання твора. Актуальнасць праблем, узнятых у камедыі. Канфлікт у п’есе. Маштабнасць сатырычных вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна. Эвалюцыя характару Тулягі. Вобразы — носьбіты аўтарскай пазіцыі: Чарнавус, Левановіч, Вера. Сродкі і прыёмы сатырычнай тыпізацыі і індывідуалізацыі. Мова персанажаў як сродак раскрыцця іх характараў. Сцэнічнае жыццё камедыі. Значэнне творчасці Кандрата Крапівы ў развіцці беларускай драматургіі.

*Міхась Зарэцкі.* Грамадскае і асабістае ў апавяданні «Ворагі». Лёсы Паўла Гуторскага — змагара за рэвалюцыйныя ідэалы, і Ніны Купрыянавай — дачкі памешчыка. Тэма кахання. М. Зарэцкі — майстар вострага сюжэта, мастацкай дэталі, глыбокі псіхолаг.

*Кузьма Чорны.* Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Канкрэтна-гістарычны змест апавядання «Макаркавых Волька». Супрацьпастаўленне гуманістычнай жыццёвай пазіцыі Волькі і агіднай паклёпніцкай дзейнасці Сафрона Дзядзюлі. Асуджэнне праяў шальмоўства і прыніжэння чалавечай годнасці. Агульначалавечае значэнне праблем, узнятых у творы.

## Беларуская літаратура сярэдзіны XX стагоддзя (1940-я – сярэдзіна 1960-х гадоў)

Беларуская літаратура ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945 гг.). Антываенны пафас і вызваленчыя матывы беларускай паэзіі і публіцыстыкі. Тэма Радзімы, яе будучыні. Паказ суровай праўды вайны, услаўленне мужнасці і гераізму народа-змагара, асуджэнне здрады Радзіме. Выкрыццё ідэалогіі фашызму. Перавага лірыкі, публіцыстыкі, сатыры.

Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945—1965). Умовы развіцця беларускай літаратуры ў пасляваеннае дзесяцігоддзе. Ваенная тэма як цэнтральная ў літаратуры. Змены ў грамадскай атмасферы сярэдзіны 1950-х гадоў і іх дабратворны ўплыў на развіццё беларускай літаратуры. Актыўнае і шматграннае развіццё мастацтва слова. Узвышэнне ў літаратуры народных ідэалаў праўды, сумленнасці і справядлівасці, гуманізму. Узмацненне крытычнага пачатку ў літаратурнай творчасці.

*Пятрусь Броўка.* Вершы «Будзем сеяць, беларусы!», «Надзя-Надзейка», «Родныя словы», «Александрына», «Вось і лета сышло…», «А ты ідзі» (2—3 вершы на выбар). Патрыятычны, вызваленчы пафас твораў паэта перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Пашырэнне ідэйна-тэматычнага і жанравага дыяпазону паэзіі П. Броўкі ў 1960—1970-я гг. Тэма паэта і паэзіі. Паэтызацыя красы прыроды. Народна-песенная аснова вершаў П. Броўкі, іх мілагучнасць.

*Аркадзь Куляшоў.* Жыццёвы і творчы шлях паэта. Вершы «Мая Бесядзь», «Над брацкай магілай», «Спакойнага шчасця не зычу нікому…», «Я хаце абавязаны прапіскаю…» (2—3 вершы на выбар), вершаваны цыкл «Маналог». Адметнасць вобразнасці і кампазіцыі верша «Мая Бесядзь». Ваенная лірыка А. Куляшова. Суровая праўда і гуманізм у паказе народнага подзвігу. Трагічнае і лірычнае, фальклорныя матывы ў баладзе «Над брацкай магілай». Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай лірыцы. Вершаваны цыкл «Маналог»: матывы памяці, вернасці сяброўству, ідэалам маладосці. Паэтычнае майстэрства А. Куляшова.

*Максім Танк.* Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць. Вершы «Спатканне», «Родная мова», «Каб ведалі», «Мой хлеб надзённы», «Завушніцы», «Ave Maria», «Працягласць дня і ночы» (2—3 вершы на выбар); паэма «Люцыян Таполя». Лірыка. Тэмы і вобразы, наватарскі характар танкаўскай паэзіі. Сцвярджэнне нязломнай духоўнай сілы народа. Адметнасць лірыкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай паэзіі. Філасофскі роздум пра чалавека, яго жыццёвае прызначэнне. Свабодны верш у паэзіі Максіма Танка.

Праблема мастака і мастацтва ў паэме «Люцыян Таполя». Увасабленне свабодалюбства, таленавітасці народа ў вобразе Люцыяна Таполі. Выкарыстанне сродкаў паэтызацыі і гратэску ў паэме. Блізкасць героя паэмы Максіма Танка да купалаўскага Гусляра.

*Янка Брыль.* Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка. Паказ вайны ў апавяданні «Memento mori». Маральны подзвіг старога селяніна ў творы. Уменне аўтара ўбачыць гераічнае за рамкамі бытавых сцэн. Асуджэнне фашызму ў апавяданні, абвостранасць гуманістычнай думкі твора.

*Пімен Панчанка.* Жыццёвы і творчы шлях паэта. Вершы «Краіна мая», «Герой», «Родная мова», «Толькі лісцем рабін шалахні…», «Крык сойкі», «Той дзень прапаў і страчаны навекі...», «Спарышы» (2—3 вершы на выбар). Лірыка. Патрыятычны пафас ваеннай паэзіі П. Панчанкі. Гераічнае і трагічнае ў вершах пра Радзіму і яе абаронцаў.

Роздум пра сэнс жыцця, гуманныя адносіны паміж людзьмі ў творах 1960-х гг. Пашырэнне тэматычнай, жанрава-стылёвай разнастайнасці лірыкі 1970—1980-х гг. Духоўная эвалюцыя лірычнага героя. Спавядальны характар, адкрытасць, шчырасць лірычнага пачуцця. Багацце сродкаў мастацкага выяўлення ў творах паэта.

*Іван Мележ.* Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Тэматыка і праблематыка рамана «Людзі на балоце». Асаблівасць драматычнага канфлікту. Шматгранныя нацыянальныя характары ў рамане. Майстэрства раскрыцця ўнутранага свету галоўных герояў — Васіля Дзятла і Ганны Чарнушкі. Нетрадыцыйны падыход аўтара да раскрыцця псіхалогіі заможных сялян. Чалавек і прырода ў творы. Паэтызацыя сялянскай працы. Псіхалагічнае майстэрства Мележа-празаіка. Нацыянальная самабытнасць творчасці І. Мележа і яе агульначалавечая значнасць.

*Уладзімір Караткевіч.* Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. Аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха»; раман «Каласы пад сярпом тваім» (кніга першая «Выйсце крыніц»; з другой кнігі — «Сякера пры дрэве» — асобныя раздзелы).

Канкрэтна-гістарычная аснова аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха». Зварот пісьменніка да легенды пра караля Стаха Горскага (пачатак XVII ст.), рамантычнае яе асэнсаванне. Асуджэнне сацыяльнага прыгнёту і ўціску. Роздум аб прызначэнні чалавека на зямлі, лёсе беларускага народа, узаемасувязі розных гістарычных эпох. Вобразы Андрэя Беларэцкага, Андрэя Свеціловіча і Надзеі Яноўскай. Асаблівасці кампазіцыі твора.

Гістарычная аснова рамана «Каласы пад сярпом тваім». Рэальныя гістарычныя асобы ў творы. Духоўны воблік галоўнага героя рамана Алеся Загорскага. Прадстаўнікі дваранства ў творы (Даніла Вежа-Загорскі, Хаданскія, Кроер). Дзеячы шляхецкага руху Яраслаў Раўбіч і Багдан Война. Стыхійны характар антыпрыгонніцкай барацьбы сялян. Хараство кахання Алеся Загорскага і Майкі Раўбіч. Своеасаблівасць мастацкага стылю рамана. Месца і роля лірычных адступленняў і пейзажных малюнкаў. Вобразная сімволіка.

*Андрэй Макаёнак.* Жыццёвы і творчы шлях драматурга. Жанравая адметнасць п’есы «Зацюканы апостал». Умоўнасць часу і месца дзеяння. Характарыстыка персанажаў, іх сімвалічнасць і падкрэсленая абагульненасць. Маральна-этычны змест камедыі, сцвярджэнне аўтарам духоўных агульначалавечых каштоўнасцей.

Беларуская літаратура перыяду 1966—пач. 1990-х гадоў

Пашырэнне сферы мастацкага даследавання рэчаіснасці. Жанравыя і тэматычныя пошукі літаратуры, паглыбленне яе чалавеказнаўчага і гуманістычнага зместу. Узмацненне аналітызму ў даследаванні мінулага і сучаснасці. Асноўныя асаблівасці прозы, паэзіі і драматургіі гэтага перыяду.

*Іван Шамякін.* Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Праблематыка рамана «Сэрца на далоні». Вастрыня канфлікту. Маральна-этычная сутнасць аўтарскай пазіцыі. Рэтраспектыўны зварот да падзей вайны. Роля кар'ерыста Гукана, які хавае праўду пра актыўную падпольную дзейнасць доктара Савіча. Прынцыповасць і рашучасць Кірылы Шыковіча ў выкрыцці Гукана. Партызанскае мінулае Яраша. Вобраз Зосі Савіч, яе жыццёвы лёс. Маладое пакаленне ў рамане. Сімволіка назвы твора.

*Васіль Быкаў.* Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Праблематыка аповесці «Сотнікаў». Вобразы Сотнікава і Рыбака ў творы, іх глыбокі псіхалагізм. Персанажы другога плана ў аповесці (староста, Дзёмчыха, Бася), іх мужнасць. Выкрыццё паліцаяў — прыслужнікаў немцаў — у творы (Партноў, Стась Гаманюк, Будзіла). Мастацкая дасканаласць твора.

Актуальнасць маральна-філасофскай праблематыкі аповесці «Знак бяды». Маштабнасць характараў галоўных герояў — Петрака і Сцепаніды. Зварот аўтара да эпізодаў даваеннага жыцця з мэтай больш глыбокага раскрыцця характараў. Выкрыццё жорсткасці, бесчалавечнасці фашызму. Паказ прыслужнікаў акупацыйнага рэжыму. Мастацкая сімволіка твора.

Значэнне творчасці В. Быкава для развіцця беларускай літаратуры.

*Міхась Стральцоў.* Эцюды-ўспаміны пра маладосць, каханне, жыццёвыя праблемы і клопаты ў апавяданні «Сена на асфальце». Вобраз аўтара-апавядальніка. Адметнасць кампазіцыі.

*Ніл Гілевіч.* Вершы «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..», «Святочны, старажытны дух калядны...», «Паклон табе, мой беларускі краю!..», раман у вершах «Родныя дзеці» (ва ўрыўках). Шырокі тэматычны змест паэзіі. Любоў да Бацькаўшчыны, клопат пра яе лёс, шанаванне роднай мовы, захаванне культурнай спадчыны. Глыбокі лірызм, песеннасць вершаў, фальклорныя матывы ў творчасці паэта. «Родныя дзеці» як узор рамана ў вершах.

*Іван Чыгрынаў.* Памяць мінулай вайны і лёс старога лесніка Дземідзёнка ў апавяданні «Дзівак з Ганчарнай вуліцы». Зварот да традыцыйных каштоўнасцей, гармонія чалавека з прыродай, людзьмі, самім сабой. Вобраз аўтара-апавядальніка. Шырокі тэматычны змест паэзіі. Любоў да Бацькаўшчыны, клопат пра яе лёс, шанаванне роднай мовы, захаванне культурнай спадчыны. Глыбокі лірызм, песеннасць

вершаў, фальклорныя матывы ў творчасці паэта. «Родныя дзеці» як узор рамана ў вершах.

*Іван Навуменка.* Паказ лёсу моладзі ў гады вайны з фашызмам у апавяданні «Сямнаццатай вясной». Раскрыццё ў творы характараў Цімоха, Стасі і іншых герояў. Сімвалічнасць вобраза бэзу.

*Рыгор Барадулін.* Вершы «Неруш», «Яна адна, зямля вякоў…», «Заспаная раніца мжыстая…», «Пакуль жывеш, развітвайся з жыццём...», «Божа, паспагадай усім...», «Трэба дома бываць часцей» (2—3 вершы на выбар). Народнасць і самабытнасць паэзіі Р. Барадуліна. Сувязь яго творчасці з традыцыямі фальклору, міфалогіі, класічнай літаратуры. Свет Радзімы-Беларусі ў яго паэзіі, выяўленне пачуцця любові да зямлі бацькоў. Услаўленне роднага слова як духоўнай святыні. Асаблівасці паэтычнага майстэрства Р. Барадуліна.

*Яўгенія Янішчыц.* Вершы «Чаму ніколі не баюся я…», «Не воблака, а проста аблачынка…», «Любоў мая…», «Ты пакліч мяне. Пазаві…». Малая радзіма, казачная палеская прырода, вясковы і гарадскі побыт, пададзеныя ў светлых колерах у лірыцы. Спроба паяднаць традыцыйны верш і рытмізаваную прозу ў творах. Тэматычная палітра паэзіі Я. Янішчыц.

*Георгій Марчук.* Навелы «Канон Гарыні», «Канон Маці». Жанрава-стылёвая спецыфіка твораў, іх спавядальнасць. Захапляльнае падарожжа па радзіме пісьменніка, асэнсаванне жыцця палешукоў, іх традыцый. Мудрасць разумення чалавечага шчасця і іншых духоўных каштоўнасцей.

*Аляксей Дудараў.* Наватарскі падыход драматурга да ўвасаблення далёкага мінулага ў п’есе «Князь Вітаўт». Жанравая адметнасць твора, асаблівасці яго кампазіцыі. Вітаўт і Ягайла як вобразы-тыпы. Ахвярнасць, вернасць (пакаёўка Алёна) і здрада, халодны разлік, угодлівасць (стражнік Люцень). Праблема асабістага шчасця ў п’есе. Сцвярджэнне ў творы галоўных каштоўнасцей на зямлі: любові, еднасці, згоды і міру.

*Алесь Разанаў.* Вершы «Радзіма…», «На гэтай зямлі», «У крузе», «Спадчына», «Горад». Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка. Філасофска-інтэлектуальны кірунак творчасці: суадносіны агульначалавечага (быційнага) і нацыянальна-гістарычнага (асабістага). Традыцыі і наватарства: адметнасць жанрава-стылёвых формаў, стыль пісьма паэта. Асацыятыўная вобразнасць. Роля А. Разанава ў развіцці традыцый беларускай філасофскай паэзіі.

## Беларуская літаратура на сучасным этапе (з сярэдзіны 1990-х гг.)

Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе. Змяненне ролі літаратуры ў жыцці грамадства. Новая літаратурная сітуацыя.

Грамадскае аб’яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі» і іншыя літаратурныя суполкі. Беларускі постмадэрнізм: творчыя асобы і жанры. Найноўшая беларуская літаратура (2000–2015 гг.).

*Паэзія.* Паглыбленне маральна-філасофскага, грамадзянска-публіцыстычнага і інтымна-псіхалагічнага зместу лірыкі, разнастайнасць творчых індывідуальнасцей у сучаснай паэзіі (на прыкладзе твораў 2—3 аўтараў на выбар абітурыента).

*Проза.* Тэматыка і праблематыка сучаснай беларускай прозы: Я. Сіпакоў, Л. Дайнека, Л. Рублеўская, А. Федарэнка, А. Казлоў, У. Сцяпан, У. Саламаха, А. Наварыч і інш. (на прыкладзе творчасці 2—3 пісьменнікаў на выбар абітурыента).

*Драматургія.* Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці сучаснай беларускай драматургіі: А. Петрашкевіч, С. Кавалёў, Г. Марчук, І. Сідарук і інш. (на прыкладзе творчасці 1—2 аўтараў на выбар абітурыента).